№ 33 (290)
Верасень 2009 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ 1000-годзе Літвы: *асноўныя даты і падзеі* – *стар. 4*

☞ Проста – *лазня* – *стар. 5*

☞ Заняпад: *дом паноў Дзендзявіцкіх* – *стар. 7*

На тым тыдні...

Пастановай ад **26 жніўня** 2009 года гарадской управы горада Гдыня (Польшча) адной з вуліцаў **нададзена імя Янкі Брыля**, беларускага пісьменніка і ўдзельніка вераснёўскай кампаніі 1939 года ў Польшчы супраць фашысцкіх захопнікаў. Цяпер ён будзе вядомы гараджанам не толькі як пісьменнік. Новая вуліца – адна з самых доўгіх у новым мікраёне Гдыні.

26 жніўня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася прэзентацыя выстаўкі **«Беларусі з любоўю»**, на якой прадстаўленыя працы мастакоў пачатку XX стагоддзя **Аляксандра Архіпенкі, Івана Клюна, Паўла Львова, Уладзіміра Татліна**. Экспазіцыя складаецца з 21 твора арыгінальнай графікі пачатку – першай трэці XX стагоддзя. Малюнкі мастакоў яскрава адлюстроўваюць эпоху зараджэння новага стагоддзя з усімі яго няяснымі трывогамі і надзеямі. Асноўная частка твораў належыць да своеасаблівага эмпірычнага накірунку графікі – гэта так званыя замалёўкі ў «альбом», «для сябе». Такая асаблівасць калекцыі надае ёй рысы непасрэднага жыцця мастацтва і адкрытасці гледачу.

27 жніўня ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрылася **выстаўка «Чароўны свет украінскай вышыўкі»**, якую падрыхтавалі разам з музеем Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур і Мінскае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў «Заповіт».

З 4 па 6 верасня ў сядзібе «Вішнёвы сад» пад Бабруйскам прайшоў **музычна-паэтычны фестываль «Культурная эвалюцыя»**. Апроч канцэртнай праграмы Алесь Камоцкі, Зміцер Вайцюшкевіч і журналістка Надзея Кудрэйка правялі майстар-класы для аўтараў-выканаўцаў, кампазітараў і паэтаў. Побач з беларускімі спевакамі і літаратарамі выступілі Леў Анінскі, Сяргей Нікіцін, Барыс Бурда, рускамоўныя творцы з нашай краіны Міхаіл Валодзін, Алена Казанцава, а таксама Галіна і Барыс Вайханскія (якія ўжо маюць досвед выпуску беларускамоўнага альбома песень) ды іншыя творцы.

Для гледачоў былі запланаваныя і два сюрпрызы. Прайшоў дзённы канцэрт аўтарскай песні для дзяцей (спявалі С. Нікіцін, Б. і Г. Вайханскія, Валянцін Каліў). Быў паказаны легендарны спектакль «Камедыя» паводле п'есаў Каэтана Марышэўскага і Францішка Аляхновіча ў пастаноўцы Андрэя Андросіка ў выкананні зорнага складу Альтэрнатыўнага тэатра. На тэрыторыі сядзібы быў закладзены вішнёвы сад.

5 верасня ў Брэсце адкрыўся **XIV Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа»**. Сёлета ён прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння М. Гогаля.

У першы дзень на галоўнай плошчы горада быў паказаны вулічны спектакль «Шоу веліканаў» народнага тэатра на хадулях з Еўпаторыі (Украіна). Усяго ж у фестывалі бралі ўдзел 25 калектываў з 10 краінаў свету – Украіны, Расіі, Польшчы, Малдовы, Ірана ды іншых.

Жыве музей, калі папаўняецца

Напачатку года гасцінна расчыніў дзверы Музей кнігі і друку ў сярэдняй школе № 3 горада Мёры (аб гэтай падзеі «Краязнаўчая газета» пісала). Нагадаю, што ініцыятар яго стварэння і кіраўнік славуты сваёй працай гісторык, настаўнік гэтай школы Вітаўт Антонавіч Ермалёнак. Па 17 раздзелах распрацавана 18 экскурсій па 45 хвілінаў. Агульная ж экскурсія для гасцей працягваецца дзве гадзіны. Тут прадстаўлена 3000 экспанатаў, што збіралі цягам 32-х гадоў сябры школьнага гуртка «Арганаўты мінулага» ды іхні кіраўнік В.А. Ермалёнак.

Ад дня адкрыцця мінула болей за паўгода. І сёння можна з пэўнасцю сказаць, што музей жыве поўным творчым жыццём і багата папаўняецца.

Падчас адкрыцця і за наступныя месяцы ў скарбніцу падаравана больш за 70 кніг ад дабрадзеяў, якія цікавяцца і клапоцяцца жыццём маладога музея. Паспрабую пералічыць некаторыя.

Дабрачынны Мёрскай акругі Віктар Вабішчэвіч падараваў «Літоўскія епархіяльныя ведамасці» 1864 года, дзе змешчаныя цікавыя звесткі па гісторыі цэркваў нашай мясцовасці, расказваецца пра пачатак будаўніцтва Узмёнскай царквы.

Калекцыянер з Глыбокага Віктар Васілеўскі перадаў падручнікі па мастацкай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў на нямецкай і польскай мовах.

Ад настаўніка гісторыі з Волкаўшчыны Міхаіла Закрэўскага – кніга польскага класіка Ігнація Крашэўскага 1907 года выдання. Некалі яна была ў бібліятэцы жонкі Лапацінскага з роду Руткевічаў, якія жылі ў цяперашнім Шаркаўшчынскім раёне.

Часлаў Станіслававіч Кашкур (на той час – начальнік раённага аддзела культуры) прынёс у дарунак выдадзены ў Маскве ў 1947 годзе падручнік Дварэцкага, які паходзіў з нашых мясцінаў. А таксама «Успаміны пра юбілейны кангрэс Ордэна Францысканаў» 1922 года выдання.

Старшыня Перабродскага сельскага Савета Галіна Уладзіміраўна Паўлоўская перадала шмат кніг 1960-х гадоў, сярод якіх зборнікі законаў Беларускай ССР і малітоўнікі з сям'і біскупа Часлава Сіповіча, які паходзіць з вёскі Дзедзіна нашага раёна.

Унікальнае выданне Петраградскага Савета на пажоўклай паперы, надрукаванае ў 1918 годзе падчас грамадзянскай вайны, а таксама драматычны твор «Цымбалік» У. Шэкспіра падаравала музею Людміла Панцялееўна Бяззубенак.

Ад выпускніцы мёрскай СШ № 3 Анастасіі Шабанавай у музей трапіла Евангелле 1844 года з дарчым надпісам, зробленым у 1905 годзе, да дня нараджэння Марыі Чарновай. Наколькі бераглі кнігі! Больш як праз 60 гадоў ад выдання кнігу неслі ў якасці падарунка. Нават знаходзячыся далёка ад радзімы, у Англіі, Анастасія Шабанава і другая выпускніца Ксенія Бялевіч не забыліся на Музей кнігі і друку ў роднай школе і прывезлі ў падарунак манеты-«навадзелы». Іх назва ад таго, што сваім выглядам дублююць кельцкія манеты 2000-гадовай даўніны. Прывезлі дзяўчаты таксама зборнік паэзіі мадэрнізму, выдадзены Оксфардскім універсітэтам у 1936 годзе. Яшчэ адна выпускніца гэтае школы Валерыя Сівоха падаравала музею варшаўскае выданне «Парады для гаспадыняў» 1882 года, дзе змешчана багата розных падказак для вядзення хатняе гаспадаркі.

Значна папоўнілася калекцыя паштовак дзякуючы падарункам выпускніцы Анастасіі Астапковіч і краязнаўцу з латышскага Даўгаўпілса Міколу Паўловічу.

Вітаўт Антонавіч Ермалёнак – выдатны педагог з 33-гадовым працоўным стажам, і яму ўдзячныя за трывалыя веды і цікавыя ўрокі не толькі вучні, але і іх бацькі. Вучыў ён і траіх дзяцей жыхаркі Мёраў Валянціны Казіміраўны Чарневіч, якая аддзячыла настаўніку тым, што перадала для музея восем кніг, сярод якіх падручнікі, рэлігійныя кніжкі, чацвёрты том са збору твораў Уладзіслава Сыракомлі 1872 года выпуску, які выдаваўся з мэтаю, каб атрыманыя сродкі пайшлі на дапамогу беднай сям'і літаратара.

(Заканчэнне на стар. 2)

Жыве музей, калі папаўняецца

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Былая вучаніца Ганна Шуверава сярод рэчаў бабулі знайшла цікавае польскае выданне «Пшэваднік» 1935 года, у якім змешчаныя турыстычныя маршруты. Ёсць там карта маршруту і па Мёрскім краі.

Шасцікласніца мёрскай школы № 3 Яна Рэут папоўніла фонды музея рэлігійнай кнігай «Беззаганная Марыя» 1876 года і выданнем фантаста Жуля Верна на польскай мове 1892 года. Вучань 7 класа Вадзім Голуб прынёс у музей газеты 1970-х гадоў, сярод якіх «Савецкая Літва» і «Праўда Украіны».

Дзевяцікласнік школы Максім Беразоўскі – з вучняў самы актыўны ў папаўненні Музея кнігі і друку. Ад яго тут сем кніг, сярод якіх падручнікі і рэлігійная літаратура.

Колішняя вучаніца Вітаўта Антонавіча, цяпер настаўніца, Таццяна Каськевіч падаравала рэлігійную кніжку кішэннага фармату «Вітай, Марыя», а таксама пасляваенныя здымкі працэсіі ў Мёрскім касцёле і паштоўку адноўленага Друйскага касцёла.

Настаўніца, якая ўжо на заслужаным адпачынку, Алена Каралёва падаравала «Абразкі з мінулай і сучаснай гісторыі» 1938 года выдання.

Прыемна, што інфармацыя пра новы музей адразу ж па адкрыцці выйшла за межы раёна, што да папаўнення ягоных фондаў спрычыніліся жыхары з іншых рэгіёнаў краіны.

Да выдадзенага ў Рыме малітоўніка «Божым шляхам» 1946 года, які прывёз з Мінска ў падарунак паэт Міхась Скобла, спрычыніўся названы ўжо раней Часлаў Сіповіч, які выкупіў у сталіцы Вялікабританіі дом і пачаў выдаваць часопісы на беларускай мове, а таксама заснаваў у Лондане беларускую бібліятэку і музей імя Францыска Скарыны. Часлаў Сіповіч – першы грэкакаталіцкі біскуп беларусаў свету. Дарэчы, малітоўнік прызначаўся для вайскоўцаў беларусаў, якія ў 1944 годзе ваявалі ў Італіі супраць фашыстаў.



Рада ў Міры

Сёлета 2 верасня пры ўдзеле міністра культуры Рэспублікі Беларусь П.П. Латушкі адбылося выязное пасяджэнне Навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры з парадкам дня «Аб ходзе выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ і прыстасаванні замкавага комплекса "Мір"». У рабоце рады па запрашэнні міністра прыняло ўдзел і шырокае кола грамадскасці, прэса, радыё і тэлебачанне.

Як вядома, П.П. Латушка ў якасці міністра ўжо наведаў шэраг гістарычных помнікаў, у тым ліку і Мір, пасля чаго слушна паставіў некалькі вострых пытанняў перад Навукова-метадычнай радай пра паляпшэнне рэстаўрацыйнай справы, асабліва ў плане кантролю за праектаваннем і правядзеннем работ на помніках культуры. Менавіта гэты накірунак быў прыняты пры разглядзе пытанняў па рэстаўрацыі Мірскага замка, як вядома, уключанага ЮНЕСКА ў Спіс помнікаў сусветнай спадчыны.

Абмеркаванне членамі рады і ўсімі прысутнымі адбылося цікавым, крытычным і канструктыўным. А самае галоўнае, мажліва, гэта было ўпершыню, калі Міністэрства культуры смела звярнулася да грамадскасці, выслухала яе думкі адносна тых недахопаў, якія адбыліся за больш чым 20-гадовы тэрмін рэстаўрацыі замка, заўважыла супадзенне думак і прапаноў. Адбыўся той «момант ісціны», калі вырашана ісці далей разам, выпраўляць памылкі разам, давесці справу рэстаўрацыі і прыстасавання Мірскага замка да адкрыцця паўнавартаснай экспазіцыі.

У рабоце рады прымалі ўдзел і выступілі старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА У. Шчасны, старшыня Беларускага камітэта ІКАМОС У. Гілеп, старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў А. Астаповіч, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны А. Бутэвіч, гісторыкі, архітэктары, дызайнеры вядучых устаноў краіны, прадстаўнікі Гродзенскай вобласці і Карэліцкага раёна.

Наш кар.

Супрацоўнік сталічнага выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міхась Шавыркін перадаў у музей староверскую царкоўную кнігу «Чэцці-мінэі» 1883 года ў драўлянай вокладцы, абцягнутай скурай для лепшага захоўвання. У ёй сабраныя расповеды пра святых і малітвы на кожны месяц года. А ягоны калега пісьменнік Юрась Пацюпа падараваў музею лацінамоўны малітоўнік «Брэвіяш» 1904 года выдання.

Падчас краязнаўчай канферэнцыі ў мястэчку Германавічы Шаркаўшчынскага раёна В.А. Ермалёнак пазнаёміўся з настаўнікам з вёскі Жукаўшчына гэтага раёна Іосіфам Квачом, які пазней даслаў «Часоўнік» XIX стагоддзя ў драўлянай вокладцы. Кніжка адметная тым, што на яе палях багата цікавых запісаў: хто калі ў вёсцы памірае ці нараджаўся, занатаваныя прыродныя з'явы – навадненне, працягласць трымання лёду і да т.п. Гэткі дзённік ці своеасаблівы летапіс паселішча.

У раздзеле духоўнай літаратуры паважнае месца займае факсімільнае выданне «Карана» на арабскай мове, якое прывезла з Турцыі настаўніку ягоная дачка.

Асобна добрым словам трэба адзначыць васьмікласніка школы № 3 Ігара Кандратовіча, які стаў добраахвотным пільным памочнікам Вітаўта Антонавіча. Хлопчык займаецца рэстаўрацыяй кніжных вокладак і старонак.

У музеі заведзены летапіс, дзе захоўваюцца фотаздымкі з урачыстасці адкрыцця, зафіксаваныя памятныя сустрэчы з ганаровымі гасцямі ды іншаземцамі – а пабывалі тут грамадзяне Літвы, Швецыі, Украіны, Польшчы, Італіі, Швейцарыі, Бельгіі, Ізраіля, Германіі. Музей наведалі дырэктары і настаўнікі гісторыі з школаў нашага раёна, загадчыкі райаддзелаў адукацыі з усёй вобласці, дэлегацыі настаўнікаў-краязнаўцаў з Глыбоцкага, Верхнядзвінскага і Сенненскага раёнаў. Усяго ж у Музеі кнігі і друку Вітаўтам Антонавічам і яго клапатлівай жонкай настаўніцай гісторыі СШ № 3 Марыяй Георгіеўнай праведзена больш за семдзесят экскурсіяў. Ад удзячных гасцей у адмысловай кнізе наведнікаў музею і ягонаму стваральніку і кіраўніку застаюцца шчырыя словы падзякі і вершы.

У летапісе музея захоўваюцца артыкулы пра стварэнне і працу незвычайнай для райцэнтра ўстановы, надрукаваныя не толькі ў раённай газеце, але і ў «Звяздзе», «Краязнаўчай газеце», «Нашым слове», «Народным слове», «Комсомольской правде», «Нашай Ніве» ды іншых выданнях. Варта дадаць, што сюжэты пра музей праходзілі ў эфіры тэлеканалаў ЛАД, АНТ, СТБ, РТР і НТБ у Беларусі.

Дэвіз Вітаўта Антонавіча «Краязнаўцы не ходзяць у адпачынак», таму экскурсіі, пошукі, разведкі, вандроўкі з вучнямі, гурткоўцамі ладзяцца ўвесь час. Адкрыцці чакаюць нястомных шукальнікаў.

Алена БАСІКІРСКАЯ,
фота аўтара

З бібліятэкі «КГ»

Мінулае, якое страляе ў нас

Вядомы гісторык і барацьбіт за захаванне беларускай нацыянальна-культурнай адметнасці Леанід Міхайлавіч Лыч прынёс у «КГ» артыкул пад інтрыгуючай назваю «Гарбачоўская перабудова як галоўны фактар беларускага Адраджэння». Інтрыгуючай таму, што, па-мойму, ніхто да яго так цесна не ўвязваў падзеі другой паловы 1980-х са зменамі, якія адбыліся ў нас на нацыянальна-культурнай глебе ў час перабудовы. Але аб гэтым, відаць, будзе гаворка на старонках «КГ» у недалёкім будучым.

Разам з тым Леанід Лыч прынёс у «КГ» і сваю чарговую кнігу пад назваю «Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.)». Бяру на сябе адказнасць сказаць, што гэтая грунтоўная гістарычная праца – новае слова да таго, што раней было сказана па праблеме міжнацыянальных адносін у Беларусі ў такі складаны ваенны і пасляваенны перыяд гісторыі. Новае яшчэ і таму, што Леанід Міхайлавіч робіць глыбокі аналіз таго, як і чаму адбывалася размыванне нацыянальных асноў духоўнага жыцця ў нашай краіне і хто вінаваты ў той, кажучы шчыра, ганебнай справе. Між іншым, аўтар да тых аргументаў, якія ён сам (ды і многія іншыя) раней прыводзіў, каб пераканаць чытача ў вінаватасці партыйнай сістэмы, асобных яе функцыянераў, дадае і новыя меркаванні: «Асабліва вінаватыя беларускія вучоныя-грамадазнаўцы перад сваім народам у тым, што яны не дараслі да правільнага разумення моўнай праблемы, ці яшчэ горш – свядома ўхіліліся ад яе асвятлення ў той час, калі ўжо трэба было біць у набат, улічваючы сапраўдны стан беларускай мовы».

Сваеасаблівай інтрыгаю манаграфіі з'яўляюцца і храналагічныя рамкі даследавання (верасень 1943 – кастрычнік 1964). З верасня 1943 года пачалося вызваленне ад фашысцкіх захопнікаў усходніх раёнаў Беларусі, у якіх стала аднаўляцца гаспадарка. А ў кастрычніку 1964 года адбылася змена ўлады і скончылася «эпоха Нікіты Хрушчова», з якою і закончыліся спробы пашырыць паўнамоцтвы саюзных рэспублік, асабліва ў нацыянальным жыцці. Акрамя таго храналагічныя рамкі манаграфіі маюць і свае аргументаваныя тры раздзелы: «Нацыянальнае жыццё на Беларусі ва ўмовах ваеннага часу (верасень 1943 – май 1945)», «Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі ў апошнія гады сталінскага таталітарызму (май 1945 – сакавік 1953)» і «Змены ў нацыянальнай палітыцы і спробы фармавання гуманных падыходаў да яе правядзення (сакавік 1953 – кастрычнік 1964)».



Услед за Леанідам Міхайлавічам, я зрабіў для сябе адну сумную выснову: колькі б мы не стваралі асяродкаў культуры – музеяў, бібліятэк, асветных і навуковых устаноў, якія ў іншых народаў скіраваныя на ўзбагачэнне іх нацыянальна-духоўнага патэнцыялу, мы іх не толькі не выкарыстоўвалі для ўзвышэння сваёй самабытнай культуры, сваёй нацыянальнай самасвядомасці, а нават наадварот – сваёй звышінтэрнацыянальнасцю на багатай навуковай і культурнай базе знішчалі і тыя кволыя парасткі бацькоўскай культуры, якія быццам з-пад асфальту прабіваліся да сонца.

Даследаваны перыяд гісторыі не выявіў з ліку беларускіх інтэлігентаў сапраўднага барацьбіта за беларускую ідэю, беларускі народ дзесяцігоддзямі заставаўся без духоўнага лідэра, якому б паверыў, за якім пайшоў бы далей. У выніку адбылася дэфармацыя нацыянальнай самасвядомасці, якая моцна паўплывала на дэнацыяналізацыю палітычнага, эканамічнага і духоўнага жыцця беларусаў наступных перыядаў. Такія сумныя высновы з кнігі Л. Лыча. І ўсё ж застаецца надзея, што ўрокі гісторыі не пройдуць бясследна.

Уладзімір ГІЛЕП

Працяг традыцыяў Скарыны

Выдатны асветнік з горада Полацка Францыск, сын Лукі, Скарына, сваю выдавецкую дзейнасць па друкаванні кніг Бібліі на роднай мове пачаў у чэшскай Празе, дзе ў 1517 годзе выйшаў Псалтыр.

Выдатны верш, прысвечаны Скарыну, напісаў беларускі пісьменнік Іван Ласкоў, які жыў і памёр пры загадкавых абставінах у Якуцку 29 чэрвеня 1994 года.

Іван ЛАСКОЎ

Ці ты думаў, Скарыне,
Прашчур наш знакаміты,
Мог ці не ты прадбачыць
Самлелай душой,
Што не толькі твой князь –
Што і люд паспаліты
Загаворыць аднойчы
на мове чужой!

Памяняў на чужацкую
матчыну мову,
Быццам світку сваю перашыў
на мундзір –
Той мундзір, што яго вынішчаў
на палову,
Бізуном катаваў, гнаў штыком у Сібір.

Праз стагоддзі гарэлыя,
з дымам і прыскам,
Праз цяжкую чыгунную гліну з жарствой
Чую я невымернае гора Францыска,
Чую, прашчур, я голас задыханы твой:

«Што вы робіце, людзі,
Што вы ўжо нарабілі!
Не сасніцца таго наймудрэйшай саве!
Вы не матчыну мову адну загубілі –
Загубілі, няшчасныя, самі сябе.

Не, яшчэ жывяце, жывяце вы нібыта,
Носіць вас сюд і туд.
Цешыць плоцкая сыць;
Мяса валіцца ў рот,
Льецца ў рот акавіта, –
Толькі мову надоўга вам не перажыць.

Мову кінулі вы у балотную плесень,
Разышліся кругі
па смярдзючай вадзе.
Разам з ёй захлынуліся
тысячы песень, –
Іх ніхто і ніколі болей не завядзе.

Мову вы, бы асенні бульбоўнік, спалілі
(А ўвесну ён вас як яшчэ б ратаваў!),
З ёю кніг вы мільёны
на вецер пусцілі –
І навошта я іх шчыраваў-друкаваў.

Так вы самі абсеклі свае карані –
Валіць ветрыкам з ног вас цяпер,
недатумкі.
Скуль збавення чакацьмеце,
скуль паратунку?

Божа літасцівы, Беларусь барані!»
Цішыня над палямі і ціш над гаямі,
Ні віхуры, ні буры, ні вайны, ні чумы;
Ды, як дрэвы з абсечанымі каранямі,
З крэктам падаем, падаем,
падаем мы.

І ніхто нам хаўтурнай кашулі не шые,
Не збірае на нашы памінкі рублі.
Толькі цягнуцца, цягнуцца рукі чужыя
Да Чарнобылем сплямленай нашай зямлі.

…Не, вялікі Скарына,
не усіх нас скарыла
Злая пуга праклёну, злое мора хлусні!
Той, якога імя тваё
крыллем акрыла –
Ён ніколі не страціць свае карані.

Праз некалькі стагоддзяў па шляху Скарыны пайшлі і якуты. Так, у 1995 годзе ў Мінску (вул. Жодзінская, 18) у выдавецтве і друкарні «Пикорп» выйшла Евангелле ад Марка на якуцкай мове – Марктан Үтүө Сурах. Гэтае выданне было здзейсненае па бласлаўленні яго праасвяшчэнства Германа – епіскапа Якуцкага і Вілюйскага. Перакладам, які зрабіла Марыя Аляксеева, апекаваўся Інстытут перакладу Бібліі (Стакгольм). Наклад Марктан Үтүө Сурах складае 5100 асобнікаў.

Алесь БАРКОЎСКІ

Абрамаў, Мей і іншыя, альбо Некалькі слоў свайго роздуму

У «КГ» № 6 за гэты год з ласкі яе галоўнага рэдактара Уладзіміра Гілепа былі апублікаваныя мае невялічкія нататкі «Абрамаў і Беларусь». Відавочна, на іх некаторыя чытачы звярнулі сваю ўвагу, як, напрыклад, даследчык літаратуры, краязнавец і паэт з Брэста Уладзімір Барысюк. Але, на мой вялікі жаль, на яго пытанне, ці нехта з раённай вертыкалі адгукнуўся на маю публікацыю, я не мог яму станоўча адпісаць.

Што і казаць, народны энтузіязм па краязнаўстве, любоў да спазнання Бацькаўшчыны сёння найбольш трымаецца на палкім жаданні, памкненні і працы невялічкага калектыву рэдакцыі «КГ», яе чытачах ды прыхільніках, а таксама невялічкіх згуртаваннях у некаторых мясцінах ды асобных энтузіястах.

Былі толькі некаторыя пробліскі і праявы да развіцця краязнаўства ў нашай дзяржаве, якія потым адразу ж гасіліся чыноўнічай бюракратыяй. Успомнім хоць бы апошнюю спробу па стварэнні Краязнаўчага таварыства нашай краіны… Даўно састарэлі «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» нашых абласцей і горада Мінска, няўклюднымі атрымаліся шмат якія раённыя гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць», дзе невядома куды падзелася вялікая колькасць ваяроў, партызанаў ды зніклых людзей, як, напрыклад, родных не проста чалавека, а славутага пісьменніка-класіка Абрамава… Што цікава, аніхто з чыноўнікаў не думае – не дбае аб перавыданні гэтых даведнікаў, як і аб выпраўленні шматлікіх хібаў і памылак. Не варухаецца нават аб выданні самай простай серыі «Краязнаўчы летапіс гарадоў і вёсак Беларусі».

Не буду хаваць, што частка маіх рукапісаў, публікацый і кніг не ўкладваюцца ў догмы, стэрэатыпы мысленняў некаторых людзей. І яны, як могуць, шкодзяць ці закрываюць мае праекты, у якіх я ўтрапёна ўдзельнічаў. Як, напрыклад, «Брэсцкая энцыклапедыя», «Спадчына» (газета «Народная трыбуна», Брэст), «Старонкі гісторыі» (газета «Заря», Брэст), «Гістарыёграф», «Сто артыкулаў з гісторыі Беларусі» (газета «Чырвоная змена», сёння яе няма), «Анталогія беларускай ваеннай паэзіі» і «Белая Русь: архівы часу» («Во славу Родины», сёння яна «Белорусская ваенная газета») ды інш.

Нечакана для мяне нейкі таемны чыноўнік закрыў мой цыкл артыкулаў у газеце «Культура» – «Рускія пісьменнікі на Беларусі». У чым яны правініліся перад нашым народам, мне так і невядома. Больш за тое, быў пастаўлены перада мною шлагбаум на атрыманне стыпендыі Прэзідэнта РБ па гэтай праблематыцы…

Вось чытаю працу даследчыка К. Бухмейера «Лев Александрович Мей (1822–1862)» (даецца ў перакладзе): «Мей валодаў грэчаскай, лацінскай, старажытнаяўрэйскай, французскай, нямецкай, англійскай, італьянскай і польскай мовамі, перакладаў з украінскай, беларускай і чэшскай». Відавочна, беларусу цікава было б даведацца пра гэта, як і пра творчасць паэта Апалона Майкова.

Як аказваецца, гэты бліскучы вершатворца ў 1870 годзе пераклаў дзве беларускія песні – «Петрусь» і «Ой, сынки мои, соколы мои…», а потым дамогся іх публікацыі.

Я ўжо не буду пісаць аб вялікай рускай паэтцы Ганне Ахматавай, якая таксама знайшла свой шлях на Зорным Возе да беларускай мовы і літаратуры і пераклала нашага Уладзіміра Дубоўку – «Клёны в пальцах своих золотых…», «Думы летят…», Максіма Лужаніна – «Верблюжий караван»…

Што і казаць, недарэчна, калі трэба мацаваць, сілкаваць сяброўства народаў, далучаць іх культуры, літаратуры, краязнаўства адно да аднаго, усё ж знаходзяцца недзе патаемныя сілы, якія выступаюць супраць гэтага ці абыякава ставіцца да творцаў не толькі сваёй краіны, але і іншых народаў, што мелі адносіны і да нашых родных палеткаў.

Міхась МАЛІНОЎСКІ
правадзейны член
Геаграфічнага
таварыства,
г. Баранавічы

Прачытаў і раю іншым

З цікавасцю прачытаў краязнаўчае выданне «Уздоўж стромы… Таямніцы», якое падрыхтаваў пісьменнік і журналіст з Магілёўшчыны Міхась Карпечанка. У ім аўтар распавядае пра таямніцы Бялыніцкага раёна (напрыклад, пра камяні з загадкавымі надпісамі). Упершыню друкуюцца факты жыцця і загадкавага знікнення пісьменніка Міколы Цэлеша. Аўтар паведаміў падрабязнасці з жыцця Люцыяна Гадлеўскага і Васіля Жудро, пра цяжкі лёс святара Паўла Данільчыка, які быў знішчаны падчас рэпрэсій. Апошні артыкул кнігі прысвечаны Чарнобыльскай трагедыі.

Неразгаданы таямнічы знак на камяні,
фота Андрэя СКОРАБАГАТАВА

Літаратурна-мастацкае выданне накладам 450 асобнікаў падараваў чытачу вядомы выдавец Віктар Хурсік. Кніга, густоўна аздобленая фотаздымкамі, будзе цікавай шырокаму колу чытачоў, асабліва беларускай моладзі. Яе магліва набыць у розных кнігарнях, напрыклад, у «Акадэмкнізе». Краязнаўчае выданне асвятляе шмат белых плямаў у гісторыі Магілёўшчыны.



Аляксей ШАЛАХОЎСКІ,
гісторык,
краязнаўца

Новае еўрапейскае каралеўства

Перадумовы каранацыі

Новы геапалітычны стан Навагарадскага[1] княства вымагаў моцных сувязяў з Еўропай. Паўднёвыя суседзі, дарэчы, ужо даўно ўсвядомілі такую неабходнасць. Прыкладам, кіеўская княгіня Вольга, «...не дамогшыся ад грэкаў прыймальных умоваў для ўсталявання аўтакефальнай архіепіскапіі, – піша ў кнізе "Дипломатия Древней Руси" А. Сахараў, – звярнулася да Атона I», германскага імператара. І ў 961 г. у Кіеве з'явілася місія біскупа Адальберта. Але «паганска-хрысціянскія ўладары не пажадалі даваць якія б то ні было царкоўныя і палітычныя правы прадстаўніку германскага караля».

Добрым прыкладам было рашэнне Данілы Галіцкага хрысціцца паводле лацінскага абраду. Ён, даўні супернік і прэтэндэнт на валоданне Панямоннем, на той час ужо пабываў у Залатой Ардзе ды, як кажуць, на ўласнай шкуры адчуў, што значыць займець ханскі ярлык на княжанне. Таму папскім паслам так лёгка ўдалося яго ўгаварыць. Для галіцка-валынскага князя значна важней было далучыцца да Еўропы, чым захаваць былую канфесійную прыналежнасць. Даніла прыняў прапанову папы на унію, быў ахрышчаны і каранаваны.

І навагарадскія феадалы пагадзіліся на хрышчэнне Мяндоўга ды ягоных ваяроў-літвы паводле лацінскага абраду. Навагарадцы бачылі значны рост магутнасці літвы-ваяроў і разумелі, што іх ваяўнічасць і напады на суседзяў пагражалі эканамічным інтарэсам навагарадскіх гарадскіх вярхоў і феадалаў. Але ахрысціліся толькі Мяндоўг з сямейнікамі ды «numerosa multitudine paganorum» – «невялікая колькасць ваяроў-язычнікаў», пэўна ж, ваяроў.

Гваім чарадом, у кіраўніцкоў Тэўтонскага ордэна таксама не было асаблівага выбару. Пасля бітвы каля Саўле пад пагрозай апынуліся не толькі працэс хрысціянізацыі Прыбалтыкі, але і само існаванне «Fratres militiae Christi» («Братоў рыцарскай службы Хрысту») – такой была афіцыйная назва ордэна мечаносцаў. І булаю ад 14 мая 1237 г. папа Рыгор IX прызнаў аб'яднанне мечаносцаў з прускімі крыжакамі – быў зацверджаны Тэўтонскі ордэн. Тэўтонцам, і ў першую чаргу тым жа мечаносцам, заставалася шукаць выбаўлення ад нападаў літвы – «зацятых ворагаў хрысціянаў», як пісаў у «Хроніцы Лівоніі» Генрык Латвійскі.

Напачатку свайго кіравання ордэнам падобным чынам вырашаць праблему абароны ордэнскіх уладанняў ад ваяроў-літвы пачаў чарговы майстар Лівонскага ордэна Андрэас фон Штырлянд [Andreas von Stirland (von Steyer)], абраны на гэтую пасаду ў 1247 г.

Відаць, не будзе памылкай сказаць, што навагарадцы таксама ўсвядомілі неабходнасць каранацыі свайго князя. Абставіны вымагалі шукаць іншыя шляхі, мяняць арыенціры, наладжваць сувязі з ворагам сваіх даўніх супляменнікаў-палачанаў – Нямецкім ордэнам. Выкананне такіх складаных палітычнай і дыпламатычнай місіяў было даручана Мяндоўгу. І ён выправіў паслоў да майстра А. фон Штырлянда. Дарэчы, за ўсімі Мяндоўгавымі дзеяннямі пільна сачылі паўднёвыя суседзі. Не выпадкова ў Галіцка-Валынскім летапісе згадана пра ягоныя таемныя сувязі з Рыгай ды пра пасланыя майстру багатыя дары. Андрэас фон Штырлянд да просьбы навагарадскага князя паставіўся зычліва, але запатрабаваў: Мяндоўг павінен прыняць хрэст ды згадзіцца на хрышчэнне ваяроў-літвы.

І ў Мяндоўга не было выбару. Яму трэба было ўмацаваць сваю ўладу і займець уплывовага хаўруснікa ды з дапамогай А. фон Штырлянда разбурыць кааліцыю, якую Даніла Галіцкі збіраў супраць Мяндоўга. І ён пагадзіўся на ўсе прапановы, тым больш што майстар абяцаў выстарацца ў папы карону для навагарадскага князя. Папа Інацэнт IV, як тое падаецца ў ягонай буле ад 17 ліпеня 1251 г., не толькі прыняў Мяндоўга «за сына Рымскага Касцёла», але і тытулаваў яго каралём, а ягоную дзяржаву назваў «regnum Lithavie». «Найдаражэйшаму ў Хрысце сыну, найяснейшаму каралю Літавіі вітанне і апостальскае бласлаўенне! – пісаў Мяндоўгу папа Інацэнт IV. – Вялікай радасцю напоўненае нашае сэрца, што ласка Божая і Збаўцы нашага Езуса Хрыста асвяціла цябе, калісь ахопленага цемрай, разам з мноствам паганцаў, ды адрадзіла праз святое хрышчэнне на хвалу Божую. Прасіў нас пакорліва праз урачыстае і спецыяльнае пасольства, каб прынялі цябе за асаблівага сына («specialem filium») Святога Рымскага Касцёла. Мы, да тваіх справядлівых памкненняў ахвотна схіляючыся, прымаем ліцвінскае каралеўства («regnum Lithavie») і ўсе землі, якія вырваў або вырвеш у будучым з рук няверных, на права і ўласнасць святога Пятра». Асобным лістом у той жа час Інацэнт IV даручыў біскупу Кульмскаму ўскласці карону на новадалучанага сына касцёла. Але ўрачысты акт каранацыі адбыўся значна пазней, у ліпені 1253 г.

Здзіслаў СІЦЬКА

(Паводле кнігі «Утроп літвы»)

(Працяг будзе)

[1] Тут і далей геаграфічныя назвы ды імёны пададзеныя ў напісанні аўтара.

Асноўныя даты і падзеі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага

Этнічнай асновай Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) стала беларуская (літвінская) народнасць, якая стварылася шляхам зліцця этнасаў славянаў і заходніх балтаў у выніку змешвання плямёнаў яцвягаў, дайновы, мазураў, літвы і прусаў. Працэсы аславяньвання балцкіх плямёнаў працягваліся да XVI ст., і беларуская мова пашыралася на захад ад Вільні і Трокаў. Ядром пры ўтварэнні дзяржавы ў сярэдзіне XIII ст. сталі беларускія землі верхняга і сярэдняга Панямоння, а таксама землі па верхнім і сярэднім цячэнні р. Віліі. ВКЛ узнікла ва ўмовах пастаяннай жорсткай барацьбы з крыжацкай агрэсіяй і пад пагрозай мангола-татарскага нашэсця. Утварэнне дзяржавы дало магчымасць народам гэтага рэгіёну адстаяць сваю незалежнасць і стварыла ўмовы для далейшага сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага і культурнага іх развіцця. Уключэнне беларускіх і ўкраінскіх земляў у склад новастворанай дзяржавы мела пераважна добраахвотны характар, яно ажыццяўлялася шляхам пагадненняў вялікіх князёў літоўскіх з беларускімі і ўкраінскімі феадаламі, пры захаванні ільготаў, прывілеяў і пэўнага самакіравання.

Утварэнне ВКЛ з цэнтрам у Навагародку адносіцца да 1240-х гг., калі па запрашэнні мясцовых баяраў тут стаў княжыць Міндоўг (сярэдзіна 1230-х – 1263). Амаль няспынная барацьба маладой дзяржавы з кааліцыяй Лівонскага ордэна, Галіцка-Валынскага княства, жамойцкіх, літоўскіх і яцвяжскіх князёў прымусіла Міндоўга пайсці на прымірэнне і саюз з Лівонскім ордэнам. У 1251 г. князь быў ахрышчаны паводле каталіцкага абраду, а ў 1253-м каранаваўся ў Новагародку каралеўскай каронай, прысланай ад імя папы Інакенція IV. Дзякуючы каранацыі Міндоўга каралеўскай каронай новая дзяржава была прызнаная еўрапейскімі дзяржавамі. У 1254 г. Міндоўг заключыў мір з галіцка-валынскім князем Данілам Раманавічам. Сын Міндоўга, Войшалк, перадаў князю Раману Данілавічу «Новгородок от Миндовга», а Слонім, Ваўкавыск «и все городы» – «от себе». Другі сын Данілы, Шварн Данілавіч, ажаніўся з дачкою Міндоўга. У 1258 г. Войшалк вярнуў княжанне ў Новагародку. Пасля паўстання жамойтаў, куршаў і земгалаў Міндоўг парваў саюз з Лівонскім ордэнам, адрокся ад каталіцызму і пачаў вайну з крыжакамі, але ў 1263-м у выніку змовы літоўскай знаці на чале з князямі Даўмонтам і Транятам быў забіты. Апошні стаў княжыць «во всей земле Литовской и Жемойти», аднак у 1264 г. быў забіты слугамі Міндоўга. Вялікім князем стаў Войшалк (1264–1267). Ён, абапіраючыся на беларускіх баяраў і галіцка-валынскіх князёў, заваяваў Нальшчаны, Дзяволтву, аб'яднаў Новагародскую, Пінскую, Полацкую і Віцебскую землі. У 1267 г. Войшалк перадаў уладу свайму швагру Шварну Данілавічу (1267–1270), які, пераадольваючы сепаратызм літоўскай знаці, працягваў аб'яднаўчы працэс і ўмацаванне дзяржавы.

Наступным вялікім князем стаў Трайдзень (1270–1282), які вёў барацьбу з Лівонскім ордэнам, князямі Нальшчанаў і Галіцка-Валынскага княства, якое імкнулася замацавацца не толькі на Палессі, але і ў Панямонні. У 1274 г. ён сіламі гарадзенцаў захапіў Драгічын і знішчыў большую частку яго насельніцтва. У адказ галіцка-валынскі князь Леў Данілавіч стварыў кааліцыю галіцка-валынскіх, смаленскіх, тураўпінскіх і інш. князёў і разам з татарскім войскам захапіў і разрабаваў Новагародак. У 1277 г. горад захапілі і разрабавалі татары – хаўруснікі Галіцка-Валынскага княства. У адказ Трайдзень разбіў аб'яднанае войска татараў і галіцка-валынскіх князёў каля Гародні. У 1279 г. літоўскае войска нанесла паражэнне лівонскім рыцарам, а ў 1281-м захапіла г. Герцыке (былую полацкую крэпасць), які Лівонскі ордэн быў вымушаны абмяняць на г. Дынабург.

Першым вядомым вялікім князем з новай дынастыі, прадстаўнікі якой кіравалі ВКЛ ажно да 1572 г., стаў Віцень (каля 1295–1316). Абапіраючыся на Новагародскае, Гарадзенскае, Полацкае і інш. княствы, ён працягваў умацоўваць дзяржаву. У 1294 г. ён задушыў паўстанне ў Жамойці, у 1298-м, выкарыстаўшы супярэчнасць паміж Лівонскім ордэнам і рыжскім арцыбіскупам, заключыў мірны дагавор з Рыгаю. У 1298 і 1305 гг. літоўскія войскі адбілі напады крыжакоў на Жамойць, а ў 1314-м – на крывіцкія землі, дзе ў бітве пад Новагародкам асабліва вызначылася войска пад камандаваннем Давыда Гарадзенскага. У 1315 г. вялікі князь са значным войскам уварваўся ў Прусію і ўзяў у аблогу моцны замак Хрыстмемель, падчас аблогі якога і загінуў. У час княжання Віценя да ВКЛ было далучана Полацкае княства (1307).

Значна пашырылася тэрыторыя ВКЛ пры наступніку Віценя Гедзіміне (1316–1341), які называў сябе ў граматах вялікім князем «літоўцаў і рускіх». У 1320 г. склад ВКЛ увайшла Віцебская зямля, у 1320–1330-я гг. – Берасцейская зямля, Менскае княства і Турава-Пінская зямля. Гедзімін заключыў саюз з мазавецкім князем Вацлавам (1322) і з польскім каралём Уладзіславам I Лакатком (1325). Выкарыстаўшы супярэчнасці паміж Рыгай і Лівонскім ордэнам, ён нанёс некалькі паражэнняў крыжакам, меў палітычны ўплыў на Кіеў, Пскоў і Ноўгарад. У 1323 г. перанёс сталіцу ВКЛ у Вільню. Яшчэ пры жыцці Гедзіміна яго сыны атрымалі спадчыну: Манівід – Кернаў і Слонім, Карыят – частку Панямоння з Новагародкам, Альгерд, князь віцебскі, – Крэва і землі па Бярэзіне, Кейстут, бацька Вітаўта, – Трокі, Гарадзенскую і Берасцейскую землі, Нарымонт – Пінскую зямлю; Вільню з вобласцю атрымаў малодшы сын Яўнут, якому быў завешчаны вялікакняжацкі трон і які быў вялікі князем у 1341–1345 гг. У выніку змовы старэйшых братоў Альгерда і Кейстута Яўнут быў скінуты.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ

(Працяг будзе)

Простыя рэчы, або Беларуская лазня

Лазня вядомая ўсходнім славянам здаўна. Пара шырока выкарыстоўвалася ў лекаванні. На Беларусі ў старажытнасці лазні былі распаўсюджаныя ў басейнах Дняпра, Заходняй Дзвіны ды Сожа, радзей на Бярэзіне. На астатняй тэрыторыі лазні амаль не сустракаліся.

Лазнямі называлі таксама маленькія язычніцкія капліцы. Мыццё цела насіла не столькі гігіенічны, колькі рытуальны характар. Пазней лазня набыла толькі утылітарнае прызначэнне.

У беларусаў лазня атаясамлівалася з месцам сутыкнення дзвюх стыхій – вады і агню, якое магло прывесці да цяжкіх вынікаў. Адсюль і мноства вераванняў. Паводле іх лазню апекаваў Лазнік. Ён быццам жыве за печчу-каменкай, ці палком. Неабходна было прытрымлівацца пэўных правілаў, каб Лазнік не спаліў пабудову. Перад уваходам у лазню казалі: «Хрышчоны – на палок, нехрышчоны – з палка», перад выхадам: «Табе баня на стаянне, а нам – на здароўе». Лазнік пужае і карае тых, хто мыецца ў лазні пасля захаду сонца. Лічылася, што ён сам любіць мыцца ў гэты час. Каб задобрыць Лазніка, у час пабудовы лазні прыносілі ахвяру – хлеб-соль, а таксама пакідалі яму ваду і венік.

Лазня была і месцам варажбы. Тут незамужнія дзяўчаты варажылі на будучага мужа. На Масленіцу лазня станавілася месцам калектыўных маладзёжных гулянняў.

Напярэдадні Чыстага чацверка беларусы абавязкова мыліся ў лазні. Казалі, што ў гэты дзень і крумкач «купае сваіх дзяцей». Ноччу пакідалі кавалак хлеба на вуліцы, і калі хлеб не замярзаў, то беларусы верылі, што ярыну не сапсуюць маразы. Гэты хлеб дзялілі паміж сямейнікамі і з'ядалі пасля лазні. Ён лічыўся гаючым. У некаторых раёнах Беларусі існаваў звычай браць з сабою ў лазню маленькі каменьчык. Нашыя продкі станавіліся на каменьчык правай нагою падчас аблівання халоднаю вадой. Камень захоўвалі да наступнага года. «Сцюдзёная» вада і камень абаранялі ад хваробаў на цэлы год.

Маладым напальвалі лазню пасля першай шлюбнай ночы. У лазні, як правіла, праходзілі роды. Лазню напальвалі і перад памінальнай вячэрай. У Мінскай губерні напярэдадні саракавін рыхтавалі лазню. Для душы памерлага пакідалі адзенне, ручнік, венік і мыла.

У дарэвалюцыйным Мінску функцыянавала некалькі грамадскіх лазняў. Лазні Плаўскага працавалі з сярэдзіны XIX стагоддзя. Лазні Каджана пабудаваны ў 1897-м, займалі двухпавярховы каменны будынак. Вада бралася з артэзіянскага калодзежа. Меліся аддзяленні для дваранаў, простых людзей, ванныя пакоі. Побач з лазнямі Каджана на беразе Свіслачы ў раёне сучаснага Траецкага прадмесця былі лазні Райніса. Яны працавалі з 1886 года і размяшчаліся ў двухпавярховым каменным будынку, там выкарыстоўвалася водаправодная вада. На першым паверсе знаходзілася агульная лазня з мужчынскім і жаночым аддзяленнямі.

Мінчанка Людміла Антонаўна Цяўлоўская, 1932 года нараджэння, узгадвала, што пасля вайны ў горадзе працавала некалькі лазняў. Самыя старыя – у раёне сучаснага Траецкага прадмесця.

«Лазня на вуліцы Маскоўскай была пабудаваная адразу пасля вайны. І была двухпавярховай. Яна абслугоўвала жыхароў прыватнай забудовы вуліц Талстога, Студэнцкай, Магілёўскай. Паход у лазню ў напаўразбураным горадзе – гэта сапраўдная падзея. У лазню хадзілі кожную суботу на цэлы дзень. З самай раніцы ці з начы займалі чаргу. Часта не толькі для сваёй сям'і, але і для суседзяў. Бралі з сабой ежу, дзеці – кнігі і падручнікі. У чарзе можна было даведацца пра ўсе апошнія навіны, паразмаўляць з суседзямі. Мыліся звычайным гаспадарчым мылам. Мыла прадавалі па картках. Квіток каштаваў 20 капеек. У лазні былі дзве душавыя кабіны. Намылішся, шчыпле вочы, зімой холадна, але стаіш па шчыкалатку ў вадзе і чакаеш сваёй чаргі, каб падставіць цела пад гарачыя струмяні. У сутарэнні прадавалі піва», – узгадвала Валянціна Сяргееўна Ліхтаровіч, 1940 года нараджэння.

З лазняй звязана шмат прыемных асабістых успамінаў. Пачатак 1980-х. Зіма. Субота. Раніца. Дзед складвае прыналежнасці для лазні, пару чыстай накрухмаленай салдацкай бялізны і бярозавы венік у палатняную сумку. Ухутвае мяне, дзесяцігадовага хлопца, у трусінае футра, апранае валёнкі і шалікам закрывае твар. Мы ідзём у лазню. Субота – нязменны лазневы дзень для ўсёй сям'і.

Ісці было даволі далёка. Прыходзілася выбіраць паміж лазнямі на вуліцы Маскоўскай і Маякоўскага. Выходзілі як мага раней. Дарэчы, у лазнях былі так званыя мужчынскія і жаночыя дні. Лазня сустракала густой сумессю пахаў бярозавага веніка, піва і сялядца. Было вялікім шчасцем не стаяць у чарзе. Папарыцца з бярозавым венікам заўсёды шмат ахвотных. Вось мы заходзім у прылазнік, распранаемся. Бяром ацынкаваныя «шайкі», мыла, мачалкі і па слізкай падлозе асцярожна прабіраемся ў «памывачнае» аддзяленне.

Цьмяная лямпачка пад столлю, бетонныя лаўкі, льецца гарачая вада. Парылка з нязменным: «А ну паддай!»

Чыстыя і стомленыя выходзім у прылазнік. Дзед апранае белую накрухмаленую бялізну і доўга голіцца небяспечнай брытвай. Адэкалон «Шипр». Затым буфет. Вялікія пузатыя куфлі піва і доўгія размовы пра жыццё-быццё. Сяброў і знаёмых заўсёды было шмат.

Летам абавязкова ў вёску – да паветра і сырадою. У вёсцы на 30 дамоў была адна лазня. Звычайна дзеці мыліся на кухні ў вялікіх тазах – начоўках. А аднойчы, давялося папарыцца і ў печы. Частыя прастудныя захворванні ўнука бабуля вырашыла павылечваць з дапамогай жару і веніка. Яна выпаліла ў печы бярозавымі дровамі, старанна выграбла вуглі і попел. Заслала ахапак саломы на чарэнь і абліла вадой. Да печы падсоўваўся стол, і я са страхам асцярожна ўпаўзаў па ім у печ. Унутры было вельмі спякотна і страшна, але дастаткова прасторна.

Лазня ў лесе недалёка ад Браслава

Побач стаялі чыгуны з цёплай вадой і дубовы венік. Бабуля казала, каб я сцёбаў сябе венікам. Пасля перапэцканы сажай і распараны вылазіў з печы. Мяне адмывалі, захутвалі цёплым шарсцяным шалікам і клалі ў нагрэты ложак. Хваробу як рукой зняло.

У адным з падарожжаў па Беларусі мне давялося набрысці на пачарнелую ад сонца і дажджу маленькую вясковую лазню. Схавалася яна ў чаратах на беразе цудоўнага ляснога возера Браслаўшчыны. Дах пакасіўся, побач са зрубам, пакрытым зялёным налётам, куча растрэсканых камянёў і попелу. Рыпучыя дзверы зачыненыя на засаўку. Па ўсім бачна, што яна даўно не адчувала дотыку чалавечых рук.

Лазня была пабудаваная са шчыльна прыгнаных бярвенняў, уцепленых мохам, каб «дух не выходзіў». Зруб пастаўлены на чатыры камяні. У памяшканні з нізкай столлю вядуць маленькія дзверы. У лазні драўляная падлога. Палілася яна па-чорным. Дым выходзіў праз дзверы і невялікае ваконца – «бакоўку», «дымнік». У даўно непаленай лазні ўстойлівы пах гару, сажы на сценах і столі.

У левым кутку лазні печ-каменка. Палілі яе, як правіла, бярозавымі дровамі, цаніліся і дубовыя. Калі печ моцна награвалася, на камяні лілі ваду ці квас, каб «паддаць духу». Чым больш было пары, тым лепшай лічылася лазня. Часамі ў кіпень дадавалі настой ліпавага цвету, бярозы, чабору, мяты, рамонкаў ці хвоі. Пучкі пахкіх зёлак клалі на палок. Пара, настоеная на зёлках, дае выдатны лекавы эфект. У сырое надвор'е асабліва карысная гарчычная пара – добрая прафілактыка прастуды. На жаль, старадаўнія рэцэпты гатавання «смачнай пары» страчаныя.

Сцены курнай лазні аблівалі кіпнем, каб не запэцкацца сажай. Уздоўж сцяны палок з асінавых дошак. Асіна горш за іншыя пароды дрэў праводзіць цяпло. Палок рабілі на пэўнай вышыні над падлогай, каб зручна было залазіць. Уздоўж сценаў будаваліся лавы. Ваду ў лазнях награвалі ў чыгунных катлах, умазаных у печ, ці ў драўляных балеях, у якія кідалі гарачыя камяні. Побач стаялі цэбры і ночвы.

Пазней сялянская лазня палепшылася за кошт павелічэння і асвятлення бакоўкі. У акно пачалі ўстаўляць шкло, дым выпускаць праз комін.

Што за лазня без веніка! Бярозавы венік нашыя продкі выкарыстоўвалі часцей за ўсё. Яго нарыхтоўвалі пасля Сёмухі. Лічылася, што ў гэты час лісты бярозы ўмацоўваліся. Такі венік гібкі, зручны. Сучасныя даследаванні паказалі, што лісце бярозы мае эфірны алей, дубільныя рэчывы, вітамін С. Дубовы венік таксама вельмі карысны. Калі ён нарыхтаваны своечасова (у жніўні), то служыць 2–3 разы. Выкарыстоўваліся і хваёвыя венікі. Але такі венік неабходна вытрымліваць у крутым кіпені 15–20 хвілінаў. Венікі нарыхтоўвалі на ўсю зіму. Іх падсушвалі ў цяньку, а пасля хавалі ў стог сена. Усю восень і зіму венікі віселі на гарышчы, ствараючы непаўторны пах.

Мыліся сяляне кожную суботу. Гаспадар прызначаў прыстаўніка, які прыбіраў смецце, змяняў трэснутыя ад вялікай тэмпературы камяні, насіў ваду. У поўдзень распальвалі печ і палілі 4–5 гадзінаў.

Гаспадары лазні па чарзе ішлі мыцца. У пачатку мыліся мужчыны і дзеці, пасля жанчыны. Запрашалі і суседзяў. Парыліся абавязкова з венікам. Затым (летам) акуналіся ў раку, абціраліся (зімой) снегам. Потым мылі галаву ў ночвах і выходзілі з лазні.

Сёння лазні ёсць паўсюль. Гэта і сучасныя лазневыя комплексы і маленькія ўтульныя лазні. Лазня – адпачынак для душы і цела.

Такія простыя рэчы, як лазня, нясуць у сабе тысячагадовы вопыт нашых продкаў, якія жылі ў гармоніі з прыродай і сваім унутраным светам. Простыя рэчы адлюстроўваюць нашую самабытнасць і з'яўляюцца часткай нашай культуры.

Сяргей ЛІХТАРОВІЧ,
г. Мінск,
фота аўтара

Бярозкі, слязою палітыя...

Ужыцці кожнага чалавека ёсць даты, якія, нібы прыступкі, узвышаюць яго на новы ўзровень або, як пуцяводная зорка, асвятляюць шлях далей. Ёсць даты любімыя і доўгачаканыя. На вялікі жаль, у лёс чалавека часам урываецца і неспадзяваная дата, якая становіцца для яго апошняй, а жыццё родных дзеліць на часткі: ДА і ПАСЛЯ. І вось гэта жыццё ПАСЛЯ часта не мае сэнсу. Яно вельмі цяжкае і шматпакутнае.

Мяне даўно цікавяць трагічныя лёсы 55 землякоў-вайскоўцаў, якія загінулі ў мірныя дні падчас праходжання ваеннай службы, хачу згадаць і аб незагойных душэўных ранах іх родных.

Мірны час і смерць ваеннаслужачага... Здаецца, не спалучаюцца гэтыя паняцці. Выпраўляючы ў армію сваіх сыноў, напэўна, усе бацькі прасілі Бога, каб толькі не было вайны. Бо вайна – усеагульнае гора, пастаянная трывога і небяспека. І вайсковец заўсёды на пярэднім краі. А тут мірнае жыццё!.. Ва ўсіх паўсядзённыя думкі і планы на будучае. Хтосьці жадаў адразу пасля службы жаніць сына, каб хутчэй цешыцца з унукаў. Нехта планаваў паслаць юнака на вучобу, іншы падбіраў свайму працу... Парознаму бачылася шчасце сына.

І хлопцы таксама марылі пра будучыню. Пасля службы самы час ажыццяўляць планы, ладзіць сямейнае жыццё, віць уласнае гняздзечка. Хтосьці марыў пра вяселле, а нехта яшчэ збіраўся прызнацца дзяўчыне ў каханні... Міналі дні, тыдні, месяцы... І бацькі, і дзеці спадзяваліся на радасную сустрэчу.

Толькі бязлітасныя тэлеграмы ў адзін момант знішчалі ўсе мары і надзеі. З хуткасцю маланкі разносілі жудасныя весткі. З твараў бацькоў назаўсёды зніклі радасць, усмешка і вечны сум агортваў іх сэрцы. Наступала тое страшнае ПАСЛЯ, калі жыццё не рухаецца наперад, а замірае на месцы. І хоць праходзяць зімы і вёсны, мінаюць гады, але бацькоўскія ўспаміны зноў і зноў вяртаюцца да таго страшнага дня, што забраў у іх самае дарагое – дзіця. З болем у сэрцы вымаўляюць родныя і назву той мясціны, дзе здарылася трагедыя. Гэта не толькі беларускія мясціны (Полацк, Барысаў, Калодзішчы, Мар'іна Горка), але і паселішчы па ўсім некалі вялізным Савецкім Саюзе ды й за ягонымі межамі (Гатчына, Пенза, Северадзвінск, Сызрань, Фергана, Балтыйск, Кунгур, Арташат, Палярны, Кіравакан, Хабараўск, Лялічы, Косіха, Кінешма, Аляксандраўка, Рыбкіна ды іншыя).

Алея Памяці

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Галоўнай сцяжынкай для бацькоў стала тая, што вядзе да роднай магілы. Цяпер тут месца іх частых сустрэчаў з любым сыночкам. На вялікі жаль, толькі ва ўспамінах і думках... Ды яшчэ адна надзея – сустрэцца з ім хоць у сне. Некаторыя так і не даведаліся аб сапраўднай прычыне смерці свайго дзіцяці. Так і дажываюць з незагойнай душэўнай ранай, у вечнай самоце, з адзіным жаданнем: хутчэй апынуцца побач з родным сыночкам...

Многія бацькі засталіся сам-насам са сваім горам. Адзіным іх клопатам сталася сынава магіла. Не кладзе на яе кветкі чужая рука. У святочныя дні не стаіць тут ганаровая варта. Няма фотаздымкаў юнакоў-вайскоўцаў ні ў раённым Музеі народнай славы, ні на старонках кніг, часопісаў, газет. На Докшыччыне адзіным месцам іх ушанавання стала алея Памяці, якая знаходзіцца на паўднёвай ускраіне Докшыцаў, між дзвюх дарог. Адна з іх вядзе ў сярэднюю школу № 2, а другая кіруецца да Віцебска і Мінска – у блізкі і далёкі свет. Некалькі гадоў таму дрэўцы пасадзілі маці загінулых з дапамогай докшыцкіх школьнікаў. Маладыя стройныя бярозкі, нібы прыгажуні-нявесты, пільна ўглядаюцца ў дарогу, цярпліва чакаюць сваіх жаніхоў, якія навек засталіся на службе. Кожнага паасобку падпільнавала небяспека. У розных мясцінах – блізка і вельмі далёка ад дому, у розныя поры года – халоднай зімою і спякотным летам, у час вясновай квецені і восеньскай пазалоты. Агульнае толькі тое, што маладое жыццё абарвалася ў мірны час, што кожны з юнакоў прысягаў на вернасць Радзіме і рабіў магчымае, каб над ёй было мірнае неба. Я не толькі бачыў бацькоўскае гора, але разам перажыў яго. Мой родны брат Мікалай таксама аддаў жыццё Радзіме – загінуў у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў. Мне вельмі зразумелы і чужы боль. Я з вялікай увагаю выслухаў расказы-споведзі родных, успаміны настаўнікаў, сяброў, знаёмых кожнага загінулага, пазнаёміўся з архіўнымі матэрыяламі. І ўсё вылілася ў кнігу «Недаспяваная песня», якая выйшла ў 2001 годзе ў выдавецтве «Беларусь». Неўзабаве быў і працяг – у 2004 годзе выдавецтва «Пантограф» выдала кнігу «Недаспяваная песня ў сэрцы гучыць». Гэтымі выданнямі я хачу нізка пакланіцца родным загінулых за перажытыя боль і пакуты, незлічоныя слёзы і падзякаваць за шчырыя ўспаміны, за самыя дарагія і памятныя фотаздымкі. Ведайце, што ёсць нямала людзей, якія падзяляюць ваша гора. Для іншых жаняхай бярозкі з алеі Памяці стануць цяпер не проста дрэўцамі, але і памяццю пра тых, хто не даспяваў сваю песню, не паспеў прачытаць пісьмо з дому, не ажыццявіў запаветную мару, не сустрэў сваю каханую, не дагледзеў адзінокую матулю...

Прапаную чытачам «Краязнаўчай газеты» некалькі ўспамінаў пра герояў шчымлівай кнігі і мой верш.

Фёдар ПАЛАЧАНІН,
г. Докшыцы

Паводле ўспамінаў бацькі і першай настаўніцы Мікалая Модаля (нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Козікі, памёр ад апёкаў у Кіравакане ў 1970 годзе)

Мікалай Модаль

Янкаўскую васьмігадовую школу Мікалай закончыў на «добра» і «выдатна». Меў прыкладныя паводзіны. Яго першая настаўніца Ніна Пракопаўна Кваціньская ўспамінае: «Коля быў здольным хлопчыкам, моцным вучнем, імкнуўся неяк выдзеліцца сярод сваіх равеснікаў. Яму падабалася быць лідэрам. Хлопчыка вельмі цікавіла навука. Асабліва праявіліся яго здольнасці ў рускай мове. Колю замацавалі за слабейшымі вучнямі, якім ён з ахвотай дапамагаў. Калі-небудзь і сам выступаў у ролі настаўніка з вучнямі малодшых класаў. Хлопчык рос дысцыплінаваным, акуратным, прыгожым. Выдзяляўся добрымі паводзінамі, умеў сябраваць з равеснікамі. Па характары быў добры, вясёлы, гаваркі».

У Докшыцкай СШ Мікалай лічыўся прыкладным вучнем, добрым таварышам, умелым арганізатарам, у лагеры працы і адпачынку быў камандзірам атрада. Ягоны атрад заўсёды быў наперадзе.

У 1969 годзе Мікалай закончыў Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 28 нафтавікоў. Выпускныя кваліфікацыйныя экзамены здаў з ацэнкай «выдатна».

Пасля вучылішча Мікалай быў прызваны ў армію. З пачатку службы – выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Меў шмат падзякаў ад камандавання. Яму прысвоілі званне малодшага сяржанта.

Пасля баявых вучэнняў у часці ўзнік пажар. Мікалай па трывозе кінуўся ў агонь ратаваць таварышаў, вынес з агню аднаго і кінуўся па другога. У полымі сам атрымаў смяротныя апёкі. Мікалай па-геройску загінуў на баявым пасту.

З успамінаў маці Сяргея Баброўскага (нарадзіўся ў 1960 годзе на станцыі Круляўшчына, памёр у 1980 годзе)

Сяргей Баброўскі

Сярожа рос чулым, паслухмяным хлопчыкам. У школе вучыўся добра, у яго было шмат сяброў. Вельмі дапамагаў мне па гаспадарцы. Пакуль я на працы, ён і падлогу вымые, і ў кожным пакоі букет паставіць.

Сярожа з пяшчотаю ставіўся да нас с бацькам. Адыходзячы ў школу, пастаянна цалаваў. Аднойчы яму бацька сказаў:

– Сярожа, ты ўжо дарослым стаў, а ўсё яшчэ нас цалуеш...

Сын, усміхаючыся, адказаў:

– Буду так рабіць да той пары, пакуль дзяўчынак не пачну цалаваць.

Сярожа рос на віду ўсёй вёскі. Людзі ведалі, што дзеці ў нас працавітыя і добрыя, ветлівыя і сумленныя.

Спачатку сын паступіў у Маладзечанскае радыёвучылішча, але неўзабаве забраў дакументы. Сябры падгаварылі ісці разам у армію, і ўсе паступілі ў Глыбоцкае СПТВ.

Пасля заканчэння вучылішча Сярожа пайшоў у армію. Служыць давялося ў Прыбалтыцы. На другі год службы прыслаў ліст, дзе паведамляў, што едзе на вучэнне ў Гродзенскую вобласць і доўга не будзе пісаць. А пасля прыйшла вестка, што сын цяжка хворы. Бацька знаходзіўся пры ім месяц.

Калі Сярожа ляжаў у шпіталі, то марыў хутчэй паехаць дадому. Ён складаў планы на будучыню, хацеў ажаніцца адразу пасля арміі. Сястры нават сказаў, які касцюм хацеў бы апрануць на вяселле.

Алея Памяці

Іду па алеі Памяці...
Тут Памяць мяне сустракае.
Кожная маладая бярозка
Сустрэчы са мною чакае.

Яе пасадзілі матулі
У памяць любых сыноў,
Што ў мірны час загінулі
І не вярнуліся дамоў.

Кожная бярозка – Памяць,
Светлы, шчыры ўспамін,
Як жыў, працаваў, вучыўся,
Як службу праходзіў сын.

Гэтым дрэўцам матулі
Даручылі думы-ўспаміны,
Усё, што ім вядома
Аб любым родным сыне.

Палівалі іх слязінкай,
Каб бярозкі хутчэй
прыжывалі,
Каб памяць пра іх сыночкаў
Надзейна захавалі.

– Расці, бярозка, расці! –
Кожная матуля прасіла.
– Раскажы людзям праўду,
Як няшчасце сыночка
скасіла...

Шуміце, бярозкі, лістотай,
Удзень і ўночы шуміце,
Памяць пра нашых сыночкаў
Навечна збераж ыце!

Каб пра іх жыццё маладое
У новым тысячагоддзі зналі,
Каб людзі няшчасце такое
Ніколі не сустракалі.

Да 495-годдзя Аршанскай бітвы



Уздоўж

1. Газета нацыяньна-дэмакратычнага кірунку, з часу выхаду першага нумара якой сёлета спаўняецца 90 гадоў. Выдавалася да ліпеня 1920 г. **4.** Месяц, у якім у 1511 г. выдатны беларускі палкаводзец Канстанцін Астрожскі разбіў войска крымскага хана Менглі-Гірэя. **8.** Стаянка войскаў на прыватных кватэрах. **9.** Горад на Ровеншчыне (Украіна), радзіма К. Астрожскага. **11.** Трыумфальная .... Вялікія вароты, праз якія ў Вільні праехаў К. Астрожскі пасля перамогі над маскавітамі ў Аршанскай бітве 1514 г. **12.** Выдатны старажытны карфагенскі палкаводзец, з якім у Еўропе параўноўвалі К. Астрожскага. **13.** Зямля – нас усіх ...: яна нас корміць, яна нас прыгорне (прык.). **16.** Старадаўняя колючая зброя. **17.** Няволя, у якую трапіла ў выніку Аршанскай вайны каля 10 тысяч ваяроў Масковіі. **22.** Устройства для дэманстрацыі фільмаў. **23.** « ...! Радзіма, як здароўе, дарагая!» З паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». **24.** Помнік-.... Збудаванне, узведзенае ў Вільні ў гонар перамогі ваяроў ВКЛ у Аршанскай бітве. **25.** Імя, пад якім згадваецца К. Астрожскі ў пскоўскіх летапісах. **28.** Бязлесная прастора, з якой рабілі набегі на ВКЛ крымскія татары. **31.** Акружэнне войскамі ўмацаванага пункта з мэтай яго захопу. **32.** У мінулым 3-мачтавы парусны ваенны карабель. **33.** Старажытная назва г. Дзятлава. Яго К. Астрожскі атрымаў за баявыя заслугі. **34.** Княжацкі род у ВКЛ і ў Масковіі, з якога паходзіла маці Астрожскага – Анастасія.

Пачатак бітвы пад Оршай. Гравюра 1597 г.

Упоперак

1. Тое, што і артылерыя. **2.** Чорная .... Назва тэрыторыі беларускага Панямоння. **3.** Літаратурны твор (састар.). **5.** Вузенькая лінія, палоска. **6.** Гарбаценькі камісар усё поле папісаў (прык.). **7.** Рака, левы прыток Дняпра, на берагах якой адбылася Аршанская бітва. **8.** Кліч, вокліч. **10.** Зубатыя, а не кусаюцца (заг.). **14.** Злучаныя ланцугом жалезныя кольцы, якія падрыхтавалі маскавіты для ваяроў К. Астрожскага ў выпадку іх паражэння ў бітве. **15.** ..., ці бальніца. На ўласныя сродкі гэтыя лячэбныя ўстановы будаваў мецэнат К. Астрожскі. **18.** Склад зброі ці абмундзіравання. **19.** Тое, што зброя, гармата. **20.** Звод законаў ВКЛ, які быў упершыню выдадзены 480 гадоў таму. **21.** Сукупнасць ваенных аперацый. **26.** Час адпачынку за звышурочную працу. **27.** У царскай арміі казацкі афіцэрскі чын. **29.** Плошча для страявых заняткаў і ваенных парадаў. **30.** ... Чаляднін. Імя маскоўскага ваяводы, 80-тысячнае войска якога атрымала паражэнне ад 30-тысячнага войска К. Астрожскага ў час Аршанскай бітвы.

Склаў
Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск

Напамін пра добрых паноў

У вёсцы Галошава на ўзгорку ў зацішным месцы стаіць прыгожы сваімі старажытнымі абрысамі і рамантычны сваёй закінутасцю будынак. Да нядаўняга часу ён быў школай, а яшчэ раней – домам паноў Дзендзявіцкіх (побач захаваліся і рэшткі гаспадарчых пабудоў).

Пра былых гаспадароў яшчэ могуць расказаць некаторыя мясцовыя жыхары, абапіраючыся на ўспаміны сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Па іх можна меркаваць, што паны былі добрыя, да сялян ставіліся па-чалавечы, сумленна.

– Мае бацькі ў яго працавалі, – успамінае Яўген Барышаў, мужчына 1934 года нараджэння. – Ён сам быў з Варшавы. Што рабілі? А ўсё, што загадае, як у калгасе: куды брыгадзір пашле, туды работнікі ідуць. Плаціў і раз у тыдзень даваў фунт хлеба, фунт масла, фунт малака, ну і гэтак далей, розных прадуктаў па фунце. Гэта мне бацька расказваў, але што я памятаю, я ж тады малы быў.

Больш канкрэтныя высновы аб памеры аплаты можна зрабіць мяркуючы па расповедах жыхаркі пасёлка Коханава Зоі Будкевіч (1936 г.н.). Яе прабабуля Аляксандра Красоўская таксама працавала ў пана. Была пакаёўкай, а яе муж – конюхам. Зарабілі на зямлю і жывёлу для хатняй гаспадаркі (мелі 2 каровы, 2 кані), пабудавалі дом.

Аляксандра Сямёнаўна дзякуючы сваёй «пасадзе» была даволі блізкай да сямейных спраў паноў і пра некаторыя рэчы пазней расказвала праўнучцы, ужо дзелячыся ўспамінамі. Так, паведаміла, што гэтыя людзі мелі шасцёра дзяцей. Пан па адукацыі быў інжынерам. Дом пабудаваў з уласнай цэглы, выраблена на сваім цагельным заводзе. Але зямельнымі і іншымі гаспадарчымі справамі займалася пані.

У сувязі з падзеямі 1917 года паны выехалі ў Польшчу.

Сяргей АБРАМОВІЧ
Фота аўтара

Рэшткі сядзібы паноў Дзендзявіцкіх у нашы дні

Гістарычны анекдот

Перад абедам кароль Жыгімонт Стары мыў рукі, зняўшы свае пярсцёнкі, якія даў патрымаць двараніну, што абслугоўваў яго вялікасць падчас туалету. Разважаючы ў думках аб розных справах, кароль забыў пра тыя пярсцёнкі, і ні ў гэты дзень, ні пазней не ўспамінаў пра іх. Дваранін зрабіў выснову, што Жыгімонт, відаць, зусім не памятае, дзе падзеліся яго каштоўнасці, а паколькі пры двары абціраецца столькі людзей, то і не трэба аб гэтым напамінаць.

Праз нейкі час той жа дваранін зноў прыслугоўваў каралю. Але Жыгімонт, на руках якога красаваліся ўжо іншыя пярсцёнкі, і не падумаў іх здымаць. А на здзіўлены погляд свайго «асістэнта» сказаў: «Для вас дастаткова тых, што вы ўзялі раней, а гэтыя могуць спатрэбіцца каму іншаму».

* * *

Па старым звычаі кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары час ад часу наведваў Літву, дзе цешыў сябе паляваннем. Асабліва ён любіў назіраць за тым, як сабакі змагаюцца з мядзведзем. Аднойчы падчас такой сцэны пан Халецкі, староста чаркаскі, што стаяў каля яго вялікасці, здзівіўся, чаму сабакі без асаблівага жадання ідуць на звера.

– Відаць, іх занадта абкармілі перад гэтым, – выказаў меркаванне кароль, – таму і не бяруць яго.

– Тады, найяснейшы пане, – параіў староста, – пусці на мядзведзя сваіх пісараў, бо як яны ні аб'ядаюцца, а ўсё бяруць і бяруць.

* * *

Блазан старога караля Жыгімонта Станчык, назіраючы, як таму падчас хваробы ставілі п'яўкі, заўважыў: «Вось гэта сапраўдныя прыдворныя і прыяцелі яго вялікасці».

* * *

Жыгімонт Стары нічога не шкадаваў для любай жонкі Боны Сфорцы. Таму не дзіва, што каралева паступова запісала на сваё імя вялікія ўладанні. У хуткім часе нерухомая маёмасць ператварылася ў рухомую. З гэтай рухомасцю, што потым будуць называць «неапалітанскімі сумамі», аўдавелая Бона Сфорца з'ехала на радзіму.

Сярод розных спосабаў здабываць «неапалітанскія сумы» ў каралевы Боны быў і такі, як продаж службовых пасадаў – і свецкіх, і духоўных. Калі стала вядома, што каралева-ўдава збіраецца туды, адкуль прыехала, ды яшчэ разам з такімі каштоўнасцямі, сенат высунуў прапанову затрымаць яе. Для перамоваў з манархіняй паслалі біскупа Зэбжыдоўскага, аднаго з былых фаварытаў Боны, які таксама скарыстаў магчымасць і набыў сваё месца пад сонцам у яе вялікасці. Але зараз сітуацыя была зусім іншай, таму Зэбжыдоўскі пачаў даволі ультыматыўна. Тут старая каралева не вытрымала і гнеўна абарвала яго:

– І гэта кажаш ты, які купіў з майго дазволу біскупскі сан!

– Што зробіш, – сціпла ўздыхнуў пасланец сената, – купіў, бо прадавалася...

Верасень

17 – «Агатка, ці Прыезд пана», камічная опера Я.Д. Голанда, першы вядомы арыгінальны музычна-сцэнічны твор, створаны і пастаўлены на Беларусі (1784) – 225 гадоў з дня прэм'еры.

19 – Галубовіч Генадзь Міхайлавіч (1934, Капыл. р-н – 1992), графік, заслужаны работнік культуры Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

20 – Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя І.І. Стаброўскага (1929) – 80 гадоў з часу заснавання.

23 – Тарасевіч Ян (Іван Аляксеевіч; 1889 – 1961), беларускі і польскі кампазітар, музыкант, педагог, аўтар першых музычных твораў на вершы Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, М. Багдановіча, збіральнік беларускага фальклору – 120 гадоў з дня нараджэння.

25 – Данілюк Святлана Піліпаўна (1939–2003), артыстка оперы, народная артыстка Беларусі і СССР – 70 гадоў з дня нараджэння.

26 – Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій (1619, Магілёў – каля 1686), педагог-асветнік, пісьменнік, грамадскі і царкоўны дзеяч – 390 гадоў з дня нараджэння.

27 – Калюга Лукаш (сапр. Вашына Канстанцін Пятровіч; 1909, Дзяржын. р-н – 1937), пісьменнік, перакладчык – 100 гадоў з дня нараджэння.

27 – Рапановіч Яўген Нічыпаравіч (1929, Мядзел. р-н – 1987), мовазнавец, фальклярыст, аўтар грунтоўнай лексікаграфічнай працы – слоўнікаў назваў населеных пунктаў Беларусі па абласцях – 80 гадоў з дня нараджэння.

28 – Кусцінскі Міхаіл Францавіч (1829, Лепел. р-н – 1905), вучоны-археолаг, які ўпершыню на Беларусі пачаў фатаграфаваць працэс раскопак і складаць фотатэку помнікаў старажытнасцяў – 180 гадоў з дня нараджэння.

29 – Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 г., першы Статут ВКЛ, звод законаў феадальнага права (1529–1566) – 480 гадоў з часу ўвядзення ў дзеянне.

***

Стэфан Баторы, апрача роднай венгерскай мовы, дасканала валодаў лацінскай, але ніводнай з моваў сваёй новай дзяржавы так і не засвоіў. Аднойчы, размаўляючы з архібіскупам львоўскім, ён насмешліва заўважыў:

– Цікава, як гэта, не ведаючы дастаткова лаціны, можна стаць каталіцкім архібіскупам?

– Таксама, як, не ведаючы польскай мовы, можна стаць каралём Рэчы Паспалітай, – парыраваў клірык.

Сабраў і апрацаваў Леў КАЗЛОЎ. Малюнак Пятра ДРАЧОВА

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

КАЛЕНДАРЫ – выданні ў выглядзе табліц або кніжак, у якіх змешчаны пералік месяцаў года, дзён тыдня, святы, астранамічныя і інш. звесткі. У Кіеўскай Русі з X ст. каляндарныя звесткі для вызначэння пераходных рэлігійных святаў змяшчаліся ў рукапісных святцах. Вытокі беларускага друкаванага календара пачынаюцца ў «Пасхаліі» – заключнай частцы «Малой падарожнай кніжыцы» Ф. Скарыны (1522). Гэта першы ўсходнеславянскі друкаваны царкоўна-астранамічны каляндар, разлічаны на 1523–1543 гг. У ім побач з грыгарыянскім летазлічэннем дадзена і юліянскае. Пасля Брэсцкай уніі 1596 г. у ВКЛ выходзілі календары на польскай мове. Першы рускі друкаваны каляндар «Святцы, або каляндар» выдадзены ў Амстэрдаме ў 1702 г. беларусам І.Ф. Капіевічам. У канцы XVII – 1-й пал. XVIII ст. на Беларусі распаўсюджваліся календары, што выдаваліся ў Кракаве: «Рымскі і рускі каляндар» на 1690–1724 гг. Ф. Нявескага, «Каляндар польскі і рускі...» на 1708–1718 гг. Е. Кастоўскага, «Каляндар польскі і рускі» на 1747–1759 гг. Я. Негавецкага і інш. Гэтыя календары змяшчалі статыстычныя, геаграфічныя, гістарычныя і інш. звесткі і пра Беларусь. Вядомыя палітычныя календары, выдадзеныя ў 1736–1748 гг. Я. Пашакоўскім: у 1767–1795 гг. называліся «Каляндар віленскі», змяшчалі храналогію вялікіх князёў ВКЛ, прозвішчы мясцовых чыноўнікаў, астранамічныя звесткі, гаспадарчыя, медыцынскія і інш. парады. З 1730-х гг. на Беларусі пашырыліся календары, выдадзеныя ў Варшаве: «Каляндар палітычны і гістарычны на 1738 год...», «Каляндар рымскі гістарычны на год 1742», «Каляндарык палітычны для каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага» (1770–1794), «Каляндарык, цікавы для каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага» (1776, апрача гаспадарчых парад надрукаваны спіс кніг, выдадзеных у Рэчы Паспалітай за 1764 – пач. 1770-х гг.). У канцы XVIII – пач. XIX ст. у Гродне і Вільні Т. Дубіткоўскі выдаваў на польскай мове «Каляндар гаспадарчы» (1776–1800) і «Каляндар гродзенскі» (1801–1807). Гродзенскія календары мелі звесткі па краязнаўстве, пра замежныя краіны, змяшчалі гаспадарчыя парады. У Магілёве на польскай мове выходзілі «Каляндар беларускіх намесніцтваў на 1783», «Каляндар беларускі» (1784–1795). У 1799-м у Вільні надрукаваны на польскай мове «Каляндар палітычны полацкі», у Полацку – «Каляндар полацкі на 1799». У канцы XVIII – пач. XIX ст. у Магілёве і Полацку выходзілі на лацінскай мове царкоўныя календары. У 2-й пал. XIX ст. каляндарныя звесткі змяшчалі «Памятные книжки губерний». У 1889–1890 гг. у Маскве пад рэдакцыяй М.В. Доўнар-Запольскага выдадзены «Каляндар Паўночна-Заходняга краю» на 1889 і 1890 гг. У календары на 1889 г. надрукавана табліца рознасці часу паміж гарадамі Мінскай губерні і С.-Пецярбургам, Масквой, Вільняй і Варшавай, пералік аддзяленняў пошты, чыгунак, параходстваў на Дняпры, спіс кірмашоў на Беларусі, звесткі па медыцыне, пра хатнія, палявыя і лясныя работы па месяцах, статыстычныя звесткі пра Паўночна-Заходні край (тэрыторыя, насельніцтва, народная асвета і інш.). У навукова-літаратурным аддзеле змешчаны артыкул пра беларускую мову, твор В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», геаграфічны нарыс пра Беларусь IX–XII стст., геаграфічны і статыстычны агляд Рэчыцкага павета, вершы на беларускай мове, бібліяграфія. «Паўночна-Заходні каляндар» на 1892 і 1893 гг. пад рэдакцыяй А.І. Слупскага (Мінск) змяшчаў «Народны каляндар», складзены на аснове народных прыкмет, тэкстаў беларускіх абрадавых песень, прыказак і прымавак, спіс чыгунак Паўночна-Заходняга краю, параходстваў на Нёмане, Дняпры, Сожы, Дзісне. У «Паўночна-Заходнім календары на 1893 год» надрукаваны артыкул Слупскага «Гісторыя Мінска», «Легенда пра Магілёў», вершы Я. Лучыны на беларускай мове. У 1895–1918 гг. у Брэсце, Гомелі, Магілёве, Мінску і іншых гарадах Беларусі друкаваліся выданні з рознымі каляндарнымі звесткамі. У пач. XX ст. у Расійскай імперыі, у т.л. на Беларусі, распаўсюджваліся танныя, ярка афармленыя народныя календары кнігавыдаўца І.Дз. Сыціна. У 1910–1913 гг. «Беларускі каляндар» на беларускай мове выдала газета «Наша Ніва» ў Вільні (выходзіў кнігамі па 8–120 стар. тыражом 6–20 тыс. экз., кірыліцай і лацінкай). У ім змешчаны гаспадарчы каляндар па месяцах, фальклорныя творы, творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, Ц. Гартнага, Ядвігіна Ш., Г. Леўчыка, З. Бядулі, А. Гурло, У. Галубка і інш., аддзелы статыстычны, медыцынскі, юрыдычны, паштовы, спіс гарадоў і мястэчак Беларусі, кірмашоў. З 1914 г. «Беларускія календары» выдавала «Беларускае выдавецкае таварыства» ў Вільні. Пры садзеянні газеты «Гоман» (Вільня) выйшаў «Беларускі каляндар на 1917 год». У Мінску ў 1907–1920 гг. выходзіў на польскай мове «Мінскі каляндар».

Вокладкі беларускіх календароў

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 11.09.2009. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 874. Тыраж 1100 асобнікаў.